АРГАНІЧНЫ ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# АБ УРАДЗЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Праект для грамадскага абмеркавання

31.05.2024

# ЗМЕСТ

ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ 3

ГЛАВА 2. СКЛАД І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 4

ГЛАВА 3. СКЛАДАННЕ ПАЎНАМОЦТВАЎ І АДСТАЎКА ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 7

ГЛАВА 4. КАМПЕТЭНЦЫЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 9

ГЛАВА 5. ПАЎНАМОЦТВЫ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У АДНОСІНАХ З ОРГАНАМІ ВЫКАНАЎЧАЙ УЛАДЫ 15

ГЛАВА 6. ПРАВАВЫЯ АСНОВЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З ПРЭЗІДЭНТАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 16

ГЛАВА 7. ПАЎНАМОЦТВЫ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У АДНОСІНАХ З СОЙМАМ, СФАРМІРАВАНЫМІ ІМ ОРГАНАМІ І ДЭПУТАТАМІ СОЙМА 17

ГЛАВА 8. АДНОСІНЫ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З ІНШЫМІ ДЗЯРЖАЎНЫМІ ОРГАНАМІ І ОРГАНАМІ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ 19

ГЛАВА 9. АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 20

ГЛАВА 10. САЦЫЯЛЬНАЕ І МАТЭРЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЧЛЕНАЎ УРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 27

ГЛАВА 11. ПЕРАХОДНЫЯ І ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ 28

# АРГАНІЧНЫ ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
# АБ УРАДЗЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Гэты Закон на аснове і дзеля выканання Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь вызначае арганізацыю, паўнамоцтвы і парадак дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 1. Урад Рэспублікі Беларусь у сістэме органаў дзяржаўнай улады**

Урад Рэспублікі Беларусь з'яўляецца вышэйшым органам выканаўчай улады ў Рэспубліцы Беларусь.

**Артыкул 2. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь вызначаюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі законамі Рэспублікі Беларусь.

2. Урад Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе свае паўнамоцтвы непасрэдна праз міністэрствы і іншыя органы выканаўчай улады.

**Артыкул 3. Прававыя асновы дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Урад Рэспублікі Беларусь у сваёй дзейнасці кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, міжнароднымі дамовамі, законамі Рэспублікі Беларусь, а таксама сваёй Праграмай.

2. Урад Рэспублікі Беларусь згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і гэтым Законам зацвярждае Рэгламент Урада Рэспублікі Беларусь, які вызначае парадак правядзення паседжанняў Урада Рэспублікі Беларусь, падрыхтоўкі і прыняцця рашэнняў, іншыя працэдурныя пытанні яго дзейнасці, а таксама вызначае парадак распрацоўкі, выканання і маніторынга выканання праграмных дакументаў Урада Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 4. Асноўныя прынцыпы дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь**

Асноўныя прынцыпы дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь - калегіяльнасць, законнасць і галоснасць.

**Артыкул 5. Калегіяльнасць**

Урад Рэспублікі Беларусь прымае рашэнні на сваіх пасяджэннях.

**Артыкул 6. Законнасць**

Акты Урада Рэспублікі Беларусь павінны адпавядаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, гэтаму і іншым законам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 7. Галоснасць**

Урад Рэспублікі Беларусь, а таксама міністры ва ўстаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь парадку інфармуюць грамадскасць аб сваёй дзейнасці на афіцыйных сайтах

[1] Праект Арганічнага Закона "Аб Урадзе Рэспублікі Беларусь" распрацаваны ў адпаведнасці з праектам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Грамадскай канстытуцыйнай камісіі https://kanstytucyja.online/index.php/text/by

Урада Рэспублікі Беларусь і міністэрстваў у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, праз сацыяльныя сеткі, іншыя медыя рэсурсы.

**Артыкул 8. Адказнасць і падсправаздачнасць Урада**

1. Урад Рэспублікі Беларусь нясе салідарную адказнасць перад Соймам за сваю дзейнасць.

2. Урад Рэспублікі Беларусь не радзей за адзін раз у год прадстаўляе Сойму гадавую справаздачу аб сваёй дзейнасці.

3. Па патрабаванні Сойма ва ўстаноўленым Статутам Сойма парадку Урад Рэспублікі Беларусь або асобныя міністры прадстаўляюць справаздачу ў Сойме аб сваёй дзейнасці.

4. Міністры падсправаздачныя і нясуць адказнасць перад Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь, а таксама ў рамках салідарнай адказнасці Урада Рэспублікі Беларусь - перад Соймам.

**Артыкул 9. Месцазнаходжанне Урада Рэспублікі Беларусь**

Урад Рэспублікі Беларусь знаходзіцца ў сталіцы Рэспублікі Беларусь - горадзе Мінску.

## ГЛАВА 2. СКЛАД І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 10. Склад Урада Рэспублікі Беларусь і статус яго членаў**

1. Урад Рэспублікі Беларусь складаецца з Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, яго намеснікаў і міністраў.

2. Пасадавы склад (колькасць і пералік пасад) Урада Рэспублікі Беларусь вызначаецца Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь.

3. Пасады членаў Урада Рэспублікі Беларусь адносяцца да палітычных пасад.

4. Заканадаўства аб дзяржаўнай службе не распаўсюджваецца на палітычныя пасады членаў Урада Рэспублікі Беларусь.

5. Працоўнае заканадаўства распаўсюджваецца на палітычныя пасады членаў Урада Рэспублікі Беларусь толькі ў частцы, якая не ўрэгулявана гэтым Законам.

6. Статус членаў Урада Рэспублікі Беларусь вызначаецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі законамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 11. Патрабаванні да членаў Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Членамі Урада Рэспублікі Беларусь могуць быць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія маюць права голасу, вышэйшую адукацыю і валодаюць дзяржаўнай мовай.

2. Не могуць быць прызначаны на пасады членаў Урада Рэспублікі Беларусь асобы, якія маюць непагашаную або нязнятую ва ўстаноўленым законам парадку судзімасць або на якіх на працягу апошняга года накладалася адміністрацыйнае спагнанне за ўчыненне карупцыйнага правапарушэння.

3. Члены Урада Рэспублікі Беларусь не маюць права выконваць любую іншую аплатную працу, якая не звязана з выкананнем службовых (працоўных) абавязкаў па месцы асноўнай службы (працы), калі іншае не ўстаноўлена законамі Рэспублікі Беларусь.

4. На членаў Урада Рэспублікі Беларусь распаўсюджваюцца патрабаванні і абмежаванні, устаноўленыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб прадухіленні карупцыі.

5. У адносінах да кандыдатаў на пасады членаў Урада Рэспублікі Беларусь з іх пісьмовай згоды праводзяцца спецыяльныя праверкі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб прадухіленні карупцыі.

**Артыкул 12. Прызначэнне на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь**

1. Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь прызначаецца на пасаду Соймам.

2. Кандыдатура на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, прапанаваная парламенцкай фракцыяй або кааліцыяй фракцый, якія маюць найбольшую колькасць дэпутатаў у сваім складзе, уносіцца ў Сойм Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь пасля кансультацый з кіраўнікамі парламенцкіх фракцый не пазней як праз адзін месяц з дня адстаўкі папярэдняга Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

3. Рашэнне аб зацвярджэнні Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь на пасадзе прымаецца Соймам не пазней, чым у двухтыднёвы тэрмін з дня ўнясення прапановы Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

4. Калі прапанаваная Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь кандыдатура на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь не атрымае падтрымкі дэпутатаў Сойма, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь у сямідзённы тэрмін прадстаўляе тую ж ці іншую кандыдатуру, рашэнне аб зацвярджэнні якой прымаецца на працягу сямі каляндарных дзён.

5. Іншая кандыдатура на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь прапануецца Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь парламенцкай фракцыяй або кааліцыяй фракцый, якія маюць найбольшую колькасць дэпутатаў у сваім складзе. Унясенню іншай кандыдатуры на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь у Сойм павінны папярэднічаць кансультацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з кіраўнікамі парламенцкіх фракцый.

6. У выпадку паўторнага адхілення прапанаванай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь кандыдатуры на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь або ў выпадку, калі Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь не прадставіць Сойму кандыдатуру Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь у тэрміны, указаныя ў пунктах 2-5 гэтага артыкула, права вылучэння кандыдатуры на пасаду Прэм'ер-міністра пераходзіць да Сойма.

7. Калі ў двухтыднёвы тэрмін з дня пераходу права на вылучэнне кандыдатуры на пасаду Прэм'ер-міністра да Сойма ён не назначыць на пасаду Прэм'ер-міністра, Прэзідэнт павінен або прызначыць Прэм'ер-міністрам кандыдата, які набраў найбольшую колькасць галасоў дэпутатаў, або прыняць рашэнне аб правядзенні датэрміновых выбараў Сойма. Рашэнне па гэтым пытанні Прэзідэнт прымае пасля афіцыйнай кансультацыі з Прэзідыумам Сойму не пазней як у месячны тэрмін пасля пераходу права на вылучэнне кандыдатуры на пасаду Прэм'ер-міністра да Сойма.

8. Кандыдат на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь прадстаўляе Сойму кандыдатаў на пасады яго намеснікаў і міністраў, а таксама падае ў Сойм Праграму дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь.

9. Галасаванне ў Сойме па пытанні прызначэння на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь праводзіцца ў паіменным рэжыме.

10. Рашэнне аб прызначэнні на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь прымаецца Соймам большасцю галасоў дэпутатаў ад канстытуцыйнага складу Сойма.

11. Рашэнне аб прызначэнні Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь прымаецца ў форме пастановы Сойма.

12. Асоба, прызначаная Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь, уступае на пасаду ў парадку, устаноўленым артыкулам 14 гэтага Закона.

**Артыкул 13. Прызначэнне членаў Урада Рэспублікі Беларусь**

Члены Урада Рэспублікі Беларусь (акрамя Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь) прызначаюцца на пасаду Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь не пазней як на пятнаццаты дзень пасля прызначэння на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 14. Уступленне на пасаду членаў Урада Рэспублікі Беларусь і пачатак работы зноў сфарміраванага Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Асоба, прызначаная на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, у дзень свайго прызначэння перад уступленнем на пасаду прыносіць на пасяджэнні Сойма прысягу члена Урада Рэспублікі Беларусь наступнага зместу: "Усведамляючы высокую адказнасць члена Урада Рэспублікі Беларусь, урачыста прысягаю на вернасць Беларускаму народу. Абавязуюся выконваць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і законы Рэспублікі Беларусь, умацоўваць суверэнітэт і незалежнасць Рэспублікі Беларусь, адстойваць правы і свабоды чалавека і грамадзяніна, клапаціцца аб дабрабыце Беларускага народа і аб устойлівым дэмакратычным развіцці грамадства".

2. Пасля прынясення прысягі Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь падпісвае яе тэкст.

3. На першым пасяджэнні Урада Рэспублікі Беларусь Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь зачытвае прысягу члена Урада Рэспублікі Беларусь, яе тэкст падпісваюць намеснікі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь і міністры.

4. Член Урада Рэспублікі Беларусь уступае ў пасаду з моманту прынясення ім прысягі члена Урада Рэспублікі Беларусь. Падпісаны членам Урада Рэспублікі Беларусь тэкст прысягі захоўваецца ў яго асабістай справе.

5. Калі асоба не прынесла прысягу члена Урада Рэспублікі Беларусь, лічыцца, што яна адмовілася ад пасады.

6. Урад Рэспублікі Беларусь набывае паўнамоцтвы і пачынае працу пасля прынясення прысягі члена Урада Рэспублікі Беларусь не менш як дзвюма трэцямі ад яго пасадавага складу, вызначанага ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 10 гэтага Закона.

7. Член Урада Рэспублікі Беларусь, прызначаны на вакантную пасаду ў дзеючым складзе Урада Рэспублікі Беларусь, у дзень свайго прызначэння перад уступленнем на пасаду асабіста прыносіць прысягу на пасяджэнні Урада Рэспублікі Беларусь і неадкладна пасля гэтага падпісвае яе тэкст.

**Артыкул 15. Праграма дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Праграма дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь грунтуецца на ўзгодненых палітычных пазіцыях і праграмных задачах парламенцкай фракцыі (фракцый), якія падтрымалі стварэнне Урада Рэспублікі Беларусь.

2. Праграму дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь падае ў Сойм кандыдат на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

3. Рашэнне аб адабрэнні Праграмы дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь Сойм прымае адначасова з рашэннем аб прызначэнні на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь кандыдата, які падаў адпаведную Праграму.

4. Урад Рэспублікі Беларусь штогод прадстаўляе Сойму справаздачу аб выкананні Праграмы сваёй дзейнасці.

## ГЛАВА 3. СКЛАДАННЕ ПАЎНАМОЦТВАЎ І АДСТАЎКА ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 16. Складанне паўнамоцтваў Урада Рэспублікі Беларусь у сувязі з абраннем новага Сойма**

1. Урад Рэспублікі Беларусь складае паўнамоцтвы перад зноў абраным Соймам.

2. Заява аб складанні паўнамоцтваў Урада Рэспублікі Беларусь падаецца Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь або асобай, якая выконвае яго паўнамоцтвы, і абвяшчаецца на першым пленарным пасяджэнні зноў абранага Сойму.

**Артыкул 17. Адстаўка Урада Рэспублікі Беларусь**

Адстаўка Урада Рэспублікі Беларусь адбываецца з прычыны:

прыняцця Соймам рэзалюцыі недаверу Ураду Рэспублікі Беларусь;

адстаўкі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь;

смерці Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 18. Адстаўка Урада Рэспублікі Беларусь з прычыны прыняцця Соймам рэзалюцыі недаверу**

1. Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь можа паставіць перад Соймам пытанне аб даверы Ураду Рэспублікі Беларусь. Пытанне аб даверы можа быць пастаўлена на галасаванне не раней, чым па заканчэнні сямі дзён і не пазней за чатырнаццаць дзён з дня яго ўнясення і прымаецца Соймам большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу.

2. Калі Сойм адмаўляе ў даверы Ураду Рэспублікі Беларусь, Урад Рэспублікі Беларусь працягвае выконваць абавязкі да прызначэння новага Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. У гэтым выпадку Сойм павінен на працягу чатырнаццаці дзён ад даты прыняцця рэзалюцыі недаверу большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу прызначыць на пасаду новага Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, інакш уступае ў сілу дзеянне пункта 5 артыкула 102 Канстытуцыі.

3. Дэпутаты Сойму ў колькасці не менш за адну чацвёртую ад канстытуцыйнага складу маюць права паставіць перад Соймам пытанне аб недаверы Ураду Рэспублікі Беларусь. Разам з пастаноўкай пытання аб недаверы ініцыятары вылучаюць кандыдата на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, а кандыдат на пасаду Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь прадстаўляе Сойму новы склад і новую праграму Урада Рэспублікі Беларусь. Калі Сойм не раней за сем і не пазней за чатырнаццаць дзён пасля пастаноўкі пытання аб недаверы Ураду Рэспублікі большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу прызначае на пасаду новага Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, недавер Ураду Рэспублікі Беларусь лічыцца выказаным.

4. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь спыняюцца з моманту прызначэння на пасаду новага Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

5. Паўторна пытанне аб даверы або недаверы Ураду Рэспублікі Беларусь можа быць пастаўлена перад Соймам не раней, чым пасля заканчэння шасці месяцаў з дня ўнясення папярэдняй прапановы.

6. Галасаванне па пытанні недаверу Ураду Рэспублікі Беларусь не можа праводзіцца ў першыя тры месяцы пасля прызначэння Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь і ў апошнія шэсць месяцаў тэрміну паўнамоцтваў Сойма.

**Артыкул 19. Адстаўка Урада Рэспублікі Беларусь з прычыны адстаўкі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь**

1. Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь мае права заявіць аб сваёй адстаўцы.

2. Сойм разглядае пытанне аб адстаўцы Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь не пазней, чым на дзясяты дзень пасля паступлення заявы аб адстаўцы, калі яна паступіла падчас чарговай сесіі Сойма, і не пазней за першы пленарны тыдзень наступнай чарговай сесіі, калі такая заява паступіла ў міжсесійны перыяд.

3. Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь вызваляецца ад пасады з дня прыняцця рашэння аб яго адстаўцы на пленарным пасяджэнні Сойма.

4. Адстаўка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь прыводзіць да адстаўкі ўсяго складу Урада Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 20. Адстаўка Урада Рэспублікі Беларусь у выпадку смерці Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь**

1. Паўнамоцтвы Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь у выпадку яго смерці спыняюцца з дня смерці, пацверджанага пасведчаннем аб смерці.

2. Спыненне паўнамоцтваў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь у выпадку яго смерці прыводзіць да адстаўкі ўсяго складу Урада Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 21. Працяг выканання паўнамоцтваў Урадам Рэспублікі Беларусь і асобнымі членамі Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Урад Рэспублікі Беларусь, які склаў паўнамоцтвы перад зноў абраным Соймам або знаходзіцца ў адстаўцы па падставах, прадугледжаных артыкуламі 18-20 гэтага Закона, працягвае выконваць абавязкі да пачатку работы зноў сфарміраванага Урада Рэспублікі Беларусь.

2. У выпадку добраахвотнай адстаўкі, смерці або працяглай непрацаздольнасці Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь прызначае часова выконваючага абавязкі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь і Урад Рэспублікі Беларусь працягвае часова выконваць свае паўнамоцтвы да прызначэння новага Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з артыкулам 102 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

3. Для вырашэння пытання аб неабходнасці прызначэння часова выконваючага абавязкі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь не пазней, чым на шасцідзесяты дзень непрацаздольнасці пасля ўзгаднення з профільнай пастаяннай камісіяй Сойма стварае ўрачэбна-кансультацыйную камісію, якая ў двухтыднёвы тэрмін прадстаўляе неабходныя рэкамендацыі.

4. У выпадку набыцця членам Урада статусу дэпутата Сойма, яго паўнамоцтвы як члена Урада спыняюцца з дня ўступлення на пасаду дэпутата Сойма.

5. Прэм'ер-міністр прымае рашэнне аб часовым ускладанні паўнамоцтваў гэтага члена Урада на іншага члена Урада паводле свайго меркавання.

**Артыкул 22. Вызваленне ад пасады члена Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Член Урада Рэспублікі Беларусь (акрамя Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь) можа быць вызвалены ад пасады Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь па ўласнай ініцыятыве або на падставе пададзенай ім заявы аб адстаўцы.

2. У выпадку смерці члена Урада Рэспублікі Беларусь яго паўнамоцтвы лічацца спыненымі з дня яго смерці, пацверджанага пасведчаннем аб смерці.

3. Асоба прызначаецца на вакантную пасаду члена Урада Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым гэтым Законам, і ўступае ў пасаду пасля прынясення прысягі ў адпаведнасці з артыкулам 14 гэтага Закона.

4. Члены Урада Рэспублікі Беларусь, якія склалі паўнамоцтвы перад зноў абраным Соймам, або якія знаходзяцца ў адстаўцы, вызваляюцца ад сваіх пасад з пачатку працы зноў сфарміраванага Урада Рэспублікі Беларусь

# ГЛАВА 4. КАМПЕТЭНЦЫЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 23. Агульныя паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Урад Рэспублікі Беларусь:

1.1. забяспечвае выкананне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, міжнародных дамоваў, законаў і міжурадавых дамоваў;

1.2. распрацоўвае асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь і прымае меры па іх рэалізацыі;

1.3. распрацоўвае і прадстаўляе Сойму праект дзяржаўнага бюджэту, арганізуе выкананне дзяржаўнага бюджэту;

1.4. забяспечвае правядзенне адзінай эканамічнай, фінансавай, крэдытнай і грашовай палітыкі, дзяржаўнай палітыкі ў галіне навукі і інавацый, культуры, адукацыі, аховы здароўя, фізічнай культуры, спорту і турызму, экалогіі, сацыяльнага забеспячэння і аплаты працы, дзяржаўна-прыватнага партнёрства, папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, у сферах інвестыцый, канцэсій, лічбавага развіцця і іншых;

1.5. распрацоўвае і забяспечвае выкананне агульнадзяржаўных праграм эканамічнага, навукова-тэхнічнага, сацыяльнага, культурнага развіцця, аховы навакольнага асяроддзя і іншых дзяржаўных мэтавых праграм;

1.6. каардынуе, накіроўвае і кантралюе дзейнасць міністэрстваў і іншых цэнтральных і мясцовых органаў выканаўчай улады;

1.7. ажыццяўляе адміністрацыйны нагляд за выкананнем органамі мясцовага самакіравання Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь у межах і формах, вызначаных Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь;

1.8. прымае меры па забеспячэнні правоў і свабод грамадзян, абароне інтарэсаў дзяржавы, нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці, ахове грамадскага парадку, барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй;

1.9. у выпадках, прадугледжаных законам, выступае ад імя ўласніка ў адносінах да маёмасці, якая з'яўляецца ўласнасцю Рэспублікі Беларусь, а таксама арганізуе кіраванне такой маёмасцю;

1.10. мае права ствараць, рэарганізоўваць і ліквідаваць юрыдычныя асобы, маёмасць якіх знаходзіцца ва ўласнасці дзяржавы;

1.11. у выпадку стыхійнага бедства, эпідэміі, прыроднай ці тэхнагеннай катастрофы, а таксама беспарадкаў, якія суправаджаюцца гвалтам з боку групы асоб і арганізацый, пры якой дзяржаўныя органы не маюць магчымасці для нармальнага выканання сваіх абавязкаў, уводзіць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь або ў асобных яе мясцовасцях надзвычайнае становішча на тэрмін не больш за 90 дзён з унясеннем адпаведнага рашэння на разгляд Сойма на працягу двух дзён ад даты яго прыняцця.

2. Урад Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, ускладзеныя на яго Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 24. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у эканамічнай сферы**

Урад Рэспублікі Беларусь у эканамічнай сферы:

распрацоўвае праграму эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь і забяспечвае яе правядзенне;

ажыццяўляе кіраванне прыналежнымі дзяржаве аб'ектамі ўласнасці, у тым ліку карпаратыўнымі правамі;

забяспечвае правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі ў сферы дзяржаўных закупак, вызначае парадак іх ажыццяўлення;

садзейнічае развіццю прадпрымальніцтва, ажыццяўляе меры па дэманапалізацыі і антыманапольным рэгуляванні эканомікі, развіццю канкурэнцыі і рыначнай інфраструктуры;

забяспечвае ажыццяўленне дзяржаўнай рэгулятарнай палітыкі ў сферы прадпрымальніцкай дзейнасці.

**Артыкул 25. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у фінансавай сферы**

Урад Рэспублікі Беларусь у фінансавай сферы:

штогод распрацоўвае і ўносіць у Сойм законапраекты аб дзяржаўным бюджэце і аб зацвярджэнні справаздачы аб яго выкананні;

забяспечвае выкананне дзяржаўнага бюджэту;

штогод распрацоўвае і ўносіць у Сойм законапраекты аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на чарговы фінансавы год і аб зацвярджэнні справаздач аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год;

ажыццяўляе рэгуляванне ўнутранага і знешняга дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь у межах і парадку, устаноўленых Канстытуцыяй і законам Рэспублікі Беларусь;

забяспечвае прыцягненне, выкарыстанне і пагашэнне знешніх дзяржаўных пазык (крэдытаў), якія фарміруюць знешні дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь;

выступае ад імя Рэспублікі Беларусь пры прадастаўленні дзяржаўных гарантый Рэспубліцы Беларусь.

**Артыкул 26. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у сферах навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, інтэлектуальнай уласнасці, адукацыі**

Урад Рэспублікі Беларусь у сферах навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, інтэлектуальнай уласнасці, адукацыі:

забяспечвае правядзенне навукова-тэхнічнай палітыкі, развіццё і ўмацаванне навукова-тэхнічнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь, распрацоўку і выкананне агульнадзяржаўных навукова-тэхнічных праграм;

вызначае парадак фарміравання і выкарыстання фондаў для навукова-тэхнічнай дзейнасці;

прымае меры па ўдасканаленні дзяржаўнага рэгулявання ў навукова-тэхнічнай сферы;

прымае меры, накіраваныя на забеспячэнне аховы і абароны правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці;

прымае меры па стымуляванні інавацыйнай дзейнасці прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый;

распрацоўвае і ажыццяўляе асноўныя мерапрыемствы па рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі.

**Артыкул 27. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у сферах аховы здароўя, культуры, спорту і турызму**

Урад Рэспублікі Беларусь у сферах аховы здароўя, культуры, спорту і турызму:

забяспечвае правядзенне дзяржаўнай палітыкі ў сферах аховы здароўя і санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту;

забяспечвае даступнасць для грамадзян паслуг медыцынскіх і фізкультурна-аздараўленчых устаноў;

забяспечвае правядзенне дзяржаўнай палітыкі ў сферах культуры, аховы гістарычнай і культурнай спадчыны, усебаковага развіцця і функцыянавання дзяржаўнай мовы;

стварае ўмовы для свабоднага развіцця моў нацыянальных меншасцей Рэспублікі Беларусь, садзейнічае задавальненню нацыянальна-культурных патрэбаў беларусаў, якія пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь;

забяспечвае распрацоўку і ажыццяўленне мерапрыемстваў па стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы і іншых умоў, неабходных для развіцця аховы здароўя, культуры, спорту і турызму.

**Артыкул 28. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у галінах арганізацыі і аховы працы, сацыяльнай абароны і забеспячэння дэмаграфічнай бяспекі**

Урад Рэспублікі Беларусь у галінах працы, аховы працы і сацыяльнай абароны, забеспячэння дэмаграфічнай бяспекі:

прымае меры па рэалізацыі права грамадзян на працу;

выступае адным з бакоў сацыяльнага дыялогу на нацыянальным узроўні, садзейнічае яго развіццю, праводзіць кансультацыі з іншымі бакамі сацыяльнага дыялога адносна праектаў законаў, іншых нарматыўна-прававых актаў па пытаннях фарміравання і рэалізацыі дзяржаўнай сацыяльнай і эканамічнай палітыкі, рэгулявання працоўных, сацыяльных, эканамічных адносін;

распрацоўвае і ажыццяўляе меры па рацыянальным размяшчэнні прадукцыйных сіл, развіцці нацыянальнай сістэмы кваліфікацый;

забяспечвае правядзенне дзяржаўнай палітыкі занятасці насельніцтва, распрацоўкі і выканання адпаведных дзяржаўных праграм, вырашае пытанні

прафарыентацыі, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў, рэгулюе міграцыйныя працэсы, забяспечвае выкананне палажэнняў Генеральнага пагаднення ў рамках узятых на сябе абавязацельстваў;

арганізуе распрацоўку і рэалізацыю комплексу мер, накіраваных на паляпшэнне ўмоў і аховы працы, з улікам іншых напрамкаў эканамічнай і сацыяльнай палітыкі, дасягненняў у галіне навукі і тэхнікі;

забяспечвае правядзенне дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі, прымае меры па павышэнні рэальных даходаў насельніцтва і забяспечвае сацыяльную абарону грамадзян;

забяспечвае падрыхтоўку праектаў законаў аб дзяржаўных сацыяльных стандартах і сацыяльных гарантыях;

прымае меры па забеспячэнні сацыяльнай абароны грамадзян, удасканальвае сістэму сацыяльнай абароны;

забяспечвае распрацоўку і выкананне дзяржаўных праграм сацыяльнай дапамогі, прымае меры па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў сацыяльнай абароны асоб з інваліднасцю, пенсіянераў і іншых непрацаздольных і малазабяспечаных пластоў насельніцтва;

прымае меры, накіраваныя на сацыяльную інтэграцыю асоб з інваліднасцю, на стварэнне даступнага асяроддзя і паляпшэнне якасці іх жыцця, а таксама на падтрымку сем'яў, у якіх пражываюць такія асобы;

распрацоўвае і ажыццяўляе меры па паляпшэнні сацыяльна-эканамічных умоў жыццядзейнасці сем'яў з дзецьмі;

прымае меры, накіраваныя на абарону мацярынства, бацькоўства і дзяцінства, забеспячэнне роўных правоў і магчымасцей жанчын і мужчын;

распрацоўвае меры па забеспячэнні дэмаграфічнай бяспекі і каардынуе іх рэалізацыю.

**Артыкул 29. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у галіне аховы навакольнага асяроддзя**

Урад Рэспублікі Беларусь у галіне аховы навакольнага асяроддзя:

прымае меры па рэалізацыі права грамадзян на спрыяльнае навакольнае асяроддзе;

забяспечвае правядзенне дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы прыроды, экалагічнай бяспекі і прыродакарыстання;

вызначае меры па ахове навакольнага асяроддзя, навукова абгрунтаваным выкарыстанні прыродных рэсурсаў і паляпшэнні якасці навакольнага асяроддзя;

забяспечвае распрацоўку і выкананне дзяржаўных і міждзяржаўных экалагічных праграм;

ажыццяўляе ў межах сваіх паўнамоцтваў дзяржаўнае кіраванне ў галіне аховы і рацыянальнага выкарыстання зямлі, яе нетраў, водных рэсурсаў, расліннага і жывёльнага свету, іншых прыродных рэсурсаў;

усталёўвае парадак вядзення Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь, вызначае парадак правядзення маніторынгу і выкарыстання яго даных;

прымае рашэнні аб абмежаванні, часовай забароне (спыненні) або спыненні дзейнасці прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый у выпадку парушэння імі заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя;

каардынуе дзейнасць органаў выканаўчай улады, звязаную з аховай навакольнага асяроддзя, выкананнем дзяржаўных, рэгіянальных і міждзяржаўных экалагічных праграм;

забяспечвае ажыццяўленне мерапрыемстваў, прадугледжаных дзяржаўнымі праграмамі ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы, прымае рашэнні па пытаннях ліквідацыі наступстваў іншых аварый, а таксама пажараў, катастроф, стыхійных бедстваў;

абвяшчае асобныя ўчасткі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь зонамі экалагічнай рызыкі і экалагічнай катастрофы;

забяспечвае фарміраванне экалагічнай культуры, а таксама падрыхтоўку і перападрыхтоўку спецыялістаў для ажыццяўлення дзейнасці ў галіне аховы навакольнага асяроддзя;

ажыццяўляе дзяржаўнае рэгуляванне ў галіне гідраметэаралагічнай дзейнасці.

**Артыкул 30. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у галіне прававой палітыкі, законнасці, забеспячэння правоў і свабод чалавека і грамадзяніна**

Урад Рэспублікі Беларусь у галіне забеспячэння законнасці і правапарадку:

забяспечвае правядзенне дзяржаўнай прававой палітыкі;

прымае меры па забеспячэнні і абароне правоў і свабод, годнасці, жыцця і здароўя чалавека і грамадзяніна ад супрацьпраўных замахаў, ахове ўласнасці і грамадскага парадку, забеспячэнні пажарнай бяспекі, барацьбе са злачыннасцю, прадухіленні і супрацьдзеянні карупцыі;

кіруе дзейнасцю міністэрстваў, іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады, а таксама іншых дзяржаўных арганізацый у галіне прававой асветы грамадзян і прафілактыкі правапарушэнняў;

звяртаецца ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь для дачы заключэння па пытаннях адпаведнасці нарматыўных прававых актаў, міжнародных дагавораў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

арганізуе фінансавае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці праваахоўных органаў, сацыяльную абарону работнікаў названых органаў і членаў іх сем'яў;

стварае ўмовы для свабоднага развіцця і функцыянавання сістэмы юрыдычных паслуг і прававой дапамогі насельніцтву;

ажыццяўляе мерапрыемствы па забеспячэнні функцыянавання сістэмы бясплатнай юрыдычнай дапамогі.

**Артыкул 31. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у галіне забеспячэння нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці дзяржавы**

Урад Рэспублікі Беларусь у галіне забеспячэння нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці дзяржавы:

прымае меры па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці, абароне незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, арганізацыі і праходжанні воінскай службы ў парадку, вызначаным гэтым Законам;

ажыццяўляе кантроль за выкананнем дзяржаўнай праграмы ўзбраення;

арганізуе распрацоўку і фарміраванне дзяржаўнага абароннага заказу, аснашчэнне Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў, воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый узбраеннем, ваеннай тэхнікай і іншымі матэрыяльнымі каштоўнасцямі і рэсурсамі па іх заказах, а таксама вырашае пытанні будаўніцтва і размяшчэння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь абаронных аб'ектаў;

вызначае аб'ёмы матэрыяльных каштоўнасцей і бюджэтных асігнаванняў на патрэбы абароны, у тым ліку на рэалізацыю дзяржаўнай праграмы ўзбраення, правядзенне навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ у галіне абароны, забяспечвае стварэнне і захаванасць дзяржаўнага і мабілізацыйнага матэрыяльных рэзерваў, кіруе мабілізацыйнай падрыхтоўкай;

ажыццяўляе кіраўніцтва падрыхтоўкай грамадзян Рэспублікі Беларусь да воінскай службы, іх прызывам на воінскую службу, службу ў рэзерве і забяспечвае стварэнне ваеннанавучанага рэзерву;

ажыццяўляе кіраўніцтва грамадзянскай абаронай Рэспублікі Беларусь;

вырашае пытанні забеспячэння ўдзелу ваеннаслужачых Рэспублікі Беларусь у міжнародных аперацыях па падтрыманні міру і бяспекі ў парадку, вызначаным законам;

забяспечвае захаванне сацыяльных і прававых гарантый, прадугледжаных для ваеннаслужачых, грамадзянскага персаналу Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, грамадзян, звольненых з воінскай службы, і членаў іх сем'яў.

**Артыкул 32. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у галіне знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь**

Урад Рэспублікі Беларусь у галіне знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь:

ажыццяўляе каардынацыю дзейнасці ў галіне адносін Рэспублікі Беларусь з замежнымі дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі і міждзяржаўнымі ўтварэннямі;

заключае па пытаннях, якія адносяцца да яго кампетэнцыі, міжнародныя дамовы і ўдзельнічае ў падрыхтоўцы і прыняцці іншых міжнародных прававых актаў, якія змяшчаюць абавязацельствы Рэспублікі Беларусь;

прымае меры па забеспячэнні выканання міжнародных дамоваў Рэспублікі Беларусь і іншых міжнародных прававых актаў, якія змяшчаюць абавязацельствы Рэспублікі Беларусь;

прымае рашэнне аб набыцці ва ўласнасць Рэспублікі Беларусь нерухомай маёмасці, а таксама аб будаўніцтве, рэканструкцыі аб'ектаў, якія знаходзяцца за мяжой і неабходных для функцыянавання дыпламатычных устаноў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 33. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у галіне ўдасканалення дзяржаўнага кіравання і дзяржаўнай службы**

Урад Рэспублікі Беларусь у галіне ўдасканалення дзяржаўнага кіравання і дзяржаўнай службы:

ажыццяўляе мерапрыемствы па кадравым забеспячэнні органаў выканаўчай улады;

распрацоўвае і ажыццяўляе мерапрыемствы, накіраваныя на ўдасканаленне сістэмы органаў выканаўчай улады з мэтай павышэння эфектыўнасці іх дзейнасці і аптымізацыі расходаў, звязаных з утрыманнем іх апарата;

зацвярджае гранічную колькасць работнікаў органаў выканаўчай улады;

арганізуе правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі ў сферы дзяржаўнай службы;

прымае рашэнні аб стварэнні, рэарганізацыі і ліквідацыі міністэрстваў і іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады ў межах сродкаў, прадугледжаных у дзяржаўным бюджэце на іх утрыманне, а таксама зацвярджае палажэнні аб названых органах.

## ГЛАВА 5. ПАЎНАМОЦТВЫ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У АДНОСІНАХ З ОРГАНАМІ ВЫКАНАЎЧАЙ УЛАДЫ

**Артыкул 34. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у адносінах з міністэрствамі, іншымі цэнтральнымі органамі выканаўчай улады і органамі мясцовага самакіравання**

1. Урад Рэспублікі Беларусь накіроўвае і каардынуе працу міністэрстваў і іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады, якія забяспечваюць правядзенне дзяржаўнай палітыкі ў адпаведных сферах грамадскага і дзяржаўнага жыцця, выкананне Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, захавання правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

2. Міністэрствы і іншыя цэнтральныя органы выканаўчай улады адказныя перад Урадам Рэспублікі Беларусь, падсправаздачныя і падкантрольныя яму.

3. Пытанні дзейнасці міністэрстваў ва Урадзе Рэспублікі Беларусь прадстаўляюць адпаведныя міністры.

4. Дзейнасць іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады, кіраўнікі якіх не ўваходзяць у склад Урада Рэспублікі Беларусь, накіроўваецца і каардынуецца міністрамі, якія ўзначальваюць міністэрствы, да вядзення якіх адносяцца функцыі, якія ажыццяўляюцца дадзенымі органамі.

5. Пытанні дзейнасці іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады ва Урадзе Рэспублікі Беларусь прадстаўляюць адпаведныя міністры.

6. Урад Рэспублікі Беларусь можа адмяняць акты міністэрстваў і іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады поўнасцю або ў асобнай частцы.

7. Урад Рэспублікі Беларусь зацвярджае гранічную колькасць работнікаў міністэрстваў і іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады ў межах бюджэтных сродкаў, прадугледжаных на ўтрыманне органаў выканаўчай улады.

8. Урад Рэспублікі Беларусь прызначае на пасаду:

8.1. першых намеснікаў і намеснікаў міністраў - па прадстаўленні Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь;

8.2. дзяржаўных сакратароў міністэрстваў, кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады, якія не ўваходзяць у склад Урада Рэспублікі Беларусь, па прапанове Камісіі па пытаннях вышэйшага корпуса дзяржаўнай службы па выніках конкурсу ў адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўнай службе.

9. Знаходжанне названых асоб на пасадах спыняецца па рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь згодна з падставамі і ў парадку, якія ўстаноўлены Законамі Рэспублікі Беларусь "Аб цэнтральных органах выканаўчай улады", "Аб дзяржаўнай службе", а таксама ў частцы неўрэгуляванай гэтымі законамі згодна з падставамі і ў парадку, якія ўстаноўлены Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

10. Урад Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе нагляд за аднастайным выкананнем Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Урада Рэспублікі Беларусь органамі мясцовага самакіравання.

11. Урад Рэспублікі Беларусь накіроўвае і каардынуе дзейнасць выканаўчых органаў мясцовага самакіравання па пытаннях ажыццяўлення на адпаведнай тэрыторыі дэлегаваных дзяржаўнай уладай паўнамоцтваў.

12. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у адносінах з выканаўчымі органамі мясцовага самакіравання канкрэтызуюцца ў Законе Рэспублікі Беларусь "Аб мясцовым самакіраванні".

**Артыкул 35. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у адносінах з дзяржаўнымі гаспадарчымі аб'яднаннямі, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі**

1. Урад Рэспублікі Беларусь у межах сродкаў, прадугледжаных у Дзяржаўным бюджэце Рэспублікі Беларусь, можа ствараць, рэарганізоўваць і ліквідаваць у адпаведнасці з законам дзяржаўныя гаспадарчыя аб'яднанні, прадпрыемствы, установы і арганізацыі, у тым ліку для ажыццяўлення асобных функцый па кіраванні аб'ектамі, якія знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы.

2. Урад Рэспублікі Беларусь зацвярджае палажэнні і статуты дзяржаўных гаспадарчых аб'яднанняў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, памер асігнаванняў на іх утрыманне і гранічную колькасць работнікаў, прызначае на пасаду і вызваляе ад пасады іх кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў, прымяняе да іх меры дысцыплінарнай адказнасці.

3. Урад Рэспублікі Беларусь вызначае метадалогію зацвярджэння фінансавых планаў дзяржаўных гаспадарчых аб'яднанняў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый і вылічэння аб'ёму даходаў бюджэту ад кіравання дзяржаўнымі карпаратыўнымі правамі.

4. Урад Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам каардынуе і кантралюе дзейнасць указаных дзяржаўных гаспадарчых аб'яднанняў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.

5. Кіраўнікі дзяржаўных гаспадарчых аб'яднанняў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, утвораных Урадам Рэспублікі Беларусь, нясуць персанальную адказнасць перад Урадам Рэспублікі Беларусь за вынікі работы гэтых аб'яднанняў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, эфектыўнае выкарыстанне дзяржаўнай маёмасці.

## ГЛАВА 6. ПРАВАВЫЯ АСНОВЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З ПРЭЗІДЭНТАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 36. Кантрасігнацыя актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

1. У выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам Рэспублікі Беларусь "Аб Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь", гэтым Законам, акты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь падлягаюць змацаванню подпісам (кантрасігнаванню) Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

2. Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь мае права адмовіць у кантрасігнаванні, прадаставіўшы Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь матываваную адмову ў пісьмовай форме на працягу трох дзён з моманту атрымання акта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

3. У выпадку ініцыявання акта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь абавязаны на працягу трох дзён з моманту атрымання праекта такога акта падпісаць яго або адмовіць, матывавашы сваю адмову ў пісьмовай форме.

**Артыкул 37. Парадак рэалізацыі паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія ажыццяўляюцца па прадстаўленні Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Прадстаўленне Урада Рэспублікі Беларусь, прадугледжанае артыкулам 95 пунктам 2 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, уносіцца Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь на падставе пратакольнага рашэння Урада Рэспублікі Беларусь, прынятага на яго пасяджэнні.

2. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь мае права адмовіць у выкананні прадстаўлення Урада Рэспублікі Беларусь толькі ў выпадку прыняцця і падачы яго з парушэннем, устаноўленай гэтым і іншымі законамі працэдуры.

**Артыкул 38. Парадак рэалізацыі сумесных паўнамоцтваў Урада Рэспублікі Беларусь і Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

1. Сумесна з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Урад Рэспублікі Беларусь прымае меры па ахове суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці.

2. Рэалізацыя гэтых паўнамоцтваў ажыццяўляецца ў форме абмеркавання пытанняў, якія адносяцца да ўказаных сфер, на пасяджэнні Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь і прыняцця ў парадку, прадугледжаным Законам аб Савеце Бяспекі Рэспублікі Беларусь, актаў, якія падлягаюць зацвярджэнню Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Урад Рэспублікі Беларусь сумесна з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь вырашае пытанні знешняй палітыкі.

4. З гэтай мэтай Урад Рэспублікі Беларусь і Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь ствараюць на парытэтных пачатках Раду па знешняй палітыцы.

5. У склад Рады могуць уваходзіць члены Урада Рэспублікі Беларусь, работнікі Апарата Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, міністэрстваў, іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады, дэпутаты Сойма, эксперты, навуковыя і навукова-педагагічныя работнікі, якія ажыццяўляюць даследаванні ў галіне знешняй палітыкі. Абавязковым членам па пасадзе з'яўляецца Міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

6. Кіруе дзейнасцю Рады па знешняй палітыцы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

7. Рашэнні Рады па знешняй палітыцы падлягаюць зацвярджэнню Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

8. Парадак арганізацыі і дзейнасці Рады па знешняй палітыцы вызначаецца гэтым Законам і Палажэннем аб Радзе, якое зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленні Урада Рэспублікі Беларусь.

9. Міжнародныя дагаворы ад імя Рэспублікі Беларусь падпісваюцца выключна на падставе дырэктыў, прынятых Радай па знешняй палітыцы, зацверджаных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 7. ПАЎНАМОЦТВЫ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У АДНОСІНАХ З СОЙМАМ, СФАРМІРАВАНЫМІ ІМ ОРГАНАМІ І ДЭПУТАТАМІ СОЙМА

**Артыкул 39. Адносіны Урада Рэспублікі Беларусь з Соймам**

1. Урад Рэспублікі Беларусь валодае правам заканадаўчай ініцыятывы.

2. Па ўласнай ініцыятыве, а таксама ў выпадках, прадугледжаных законамі Рэспублікі Беларусь, Урад Рэспублікі Беларусь арганізуе распрацоўку праектаў законаў.

3. Урад Рэспублікі Беларусь распрацоўвае і ўносіць у Сойм праекты законаў аб рэспубліканскім бюджэце і аб зацвярджэнні справаздачы аб яго выкананні.

4. Урад Рэспублікі Беларусь распрацоўвае і ўносіць у Сойм Рэспублікі Беларусь праекты законаў аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на чарговы фінансавы год і аб зацвярджэнні справаздач аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год.

5. Урад Рэспублікі Беларусь дае заключэнні пры ўнясенні ў Сойм праектаў законаў, следствам прыняцця якіх можа быць, скарачэнне дзяржаўных сродкаў, стварэнне або павелічэнне расходаў.

6. Члены Урада Рэспублікі Беларусь маюць права прадстаўляць заключэнні адносна праектаў законаў, якія ўнесены асобнымі дэпутатамі або пастаяннымі камісіямі Сойма, па пытаннях, якія адносяцца да іх кампетэнцыі. Такія заключэнні накіроўваюцца пастаяннай камісіі Сойма, якая адказная за распрацоўку адпаведнага праекта закона.

7. Урад Рэспублікі Беларусь мае права патрабаваць ад Сойма прыняцця на сваім пасяджэнні рашэння шляхам галасавання ў цэлым за ўвесь унесены Урадам Рэспублікі Беларусь праект закона або яго частку з захаваннем толькі тых паправак, якія прапанаваны або прыняты Урадам Рэспублікі Беларусь.

8. Урад Рэспублікі Беларусь арганізуе разгляд зваротаў парламенцкіх камісій, асобных дэпутатаў па пытаннях яго дзейнасці, запытаў, пададзеных у парадку інтэрпеляцыі. Адказ на зварот дае Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь або іншы член Урада Рэспублікі Беларусь, якому адрасаваны зварот, пісьмова або ў форме выступлення на пленарным пасяджэнні Сойма з наступным абмеркаваннем.

**Артыкул 40. Адносіны Урада Рэспублікі Беларусь з Упаўнаважаным па правах чалавека**

1. Урад Рэспублікі Беларусь у межах, устаноўленых законам, забяспечвае Упаўнаважанаму па правах чалавека доступ да актаў і іншых дакументаў Урада Рэспублікі Беларусь, падведамных яму органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.

2. Урад Рэспублікі Беларусь пры наяўнасці падстаў, выкладзеных у звароце Упаўнаважанага па правах чалавека, прымае ў межах сваёй кампетэнцыі адпаведныя меры па ўстараненні парушэнняў правоў чалавека і інфармуе аб гэтым Упаўнаважанага па правах чалавека.

**Артыкул 41. Адносіны Урада Рэспублікі Беларусь з Кантрольнай палатай**

1. Урад Рэспублікі Беларусь па запыце Кантрольнай палаты прадастаўляе статыстычную, фінансавую, бухгалтарскую і іншую інфармацыю, неабходную для выканання ёю задач, функцый і паўнамоцтваў, устаноўленых Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь.

2. Урад Рэспублікі Беларусь атрымлівае ад Кантрольнай палаты звесткі аб выніках праверак, рэвізій і абследаванняў, а таксама прапановы аб прыцягненні да адказнасці асоб, вінаватых у нямэтавым і неэфектыўным выкарыстанні сродкаў,

прычыненні матэрыяльных страт дзяржаве, разглядае такія звесткі і прапановы, прымае ў межах сваёй кампетэнцыі адпаведныя меры і інфармуе аб іх Кантрольную палату.

**Артыкул 42. Адносіны Урада Рэспублікі Беларусь з Камітэтам па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі**

1. Урад Рэспублікі Беларусь праз упаўнаважаных членаў Урада Рэспублікі Беларусь у межах, устаноўленых законам, забяспечвае Камітэту па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі доступ да актаў і іншых дакументаў Урада Рэспублікі Беларусь, падведамных яму службаў разведкі і бяспекі, садзейнічае яму ў ажыццяўленні вызначаных законам паўнамоцтваў.

2. Урад Рэспублікі Беларусь атрымлівае ад Камітэта па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі прапановы па ўдасканаленні работы гэтых органаў і паведамляе аб прынятых мерах.

**Артыкул 43. Адносіны Урада Рэспублікі Беларусь з Камітэтам па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі**

Урад Рэспублікі Беларусь атрымлівае ад Камітэта па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі звесткі аб выніках праверак, а таксама прапановы па прыцягненні да адказнасці вінаватых асоб, разглядае такія звесткі і прапановы, прымае ў межах сваёй кампетэнцыі адпаведныя меры і інфармуе аб іх Камітэт па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі.

## ГЛАВА 8. АДНОСІНЫ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З ІНШЫМІ ДЗЯРЖАЎНЫМІ ОРГАНАМІ І ОРГАНАМІ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ

**Артыкул 44. Адносіны Урада Рэспублікі Беларусь з Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь**

1. Урад Рэспублікі Беларусь звяртаецца ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь для прадастаўлення заключэнняў:

1.1. па пытаннях адпаведнасці нарматыўных прававых актаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

1.2. аб адпаведнасці міжнародных дамоваў Рэспублікі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

2. Урад Рэспублікі Беларусь звяртаецца ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь для разгляду спрэчак, якія датычацца паўнамоцтваў адпаведных органаў.

3. Інтарэсы Урада Рэспублікі Беларусь у час разгляду спраў у Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь прадстаўляе пастаянны прадстаўнік Урада Рэспублікі Беларусь у Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 45. Адносіны Урада Рэспублікі Беларусь з органамі судовай улады**

1. Урад Рэспублікі Беларусь можа быць істцом і адказчыкам у судах, у прыватнасці звяртацца ў суд, калі гэта неабходна для ажыццяўлення яго паўнамоцтваў спосабам, прадугледжаным Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь.

2. Інтарэсы Урада Рэспублікі Беларусь у судах прадстаўляе Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана законамі Рэспублікі Беларусь або актамі Урада Рэспублікі Беларусь.

3. Урад Рэспублікі Беларусь узаемадзейнічае з Нацыянальнай радай правасуддзя, іншымі органамі і ўстановамі сістэмы правасуддзя па пытаннях, аднесеных да іх кампетэнцыі.

**Артыкул 46. Адносіны Урада Рэспублікі Беларусь з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь**

1. Урад Рэспублікі Беларусь сумесна з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь забяспечвае правядзенне адзінай грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

2. Урад Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь інфармуюць адзін аднаго аб меркаваных дзеяннях, якія маюць агульнадзяржаўнае значэнне, каардынуюць сваю дзейнасць, праводзяць рэгулярныя ўзаемныя кансультацыі.

**Артыкул 47. Адносіны Урада Рэспублікі Беларусь з органамі мясцовага самакіравання**

1. Урад Рэспублікі Беларусь садзейнічае эфектыўнаму функцыянаванню і развіццю мясцовага самакіравання, захаванню правоў органаў мясцовага самакіравання, забяспечвае ўзаемадзеянне органаў выканаўчай улады з органамі мясцовага самакіравання ў вырашэнні пытанняў мясцовага значэння, у тым ліку эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

2. Урад Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе адміністрацыйны нагляд за выкананнем органамі мясцовага самакіравання Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь у межах і формах, вызначаных Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 9. АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 48. Ажыццяўленне паўнамоцтваў Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Урад Рэспублікі Беларусь накіроўвае сваю дзейнасць на выкананне Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастаноў Сойму, а таксама на выкананне Праграмы дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь.

2. Урад Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе паўнамоцтвы шляхам прыняцця рашэнняў на пасяджэннях большасцю галасоў ад службовага складу Урада Рэспублікі Беларусь, вызначанага ў адпаведнасці з артыкулам 10 гэтага Закона.

**Артыкул 49. Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь**

1. Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь:

1.1. кіруе працай Урада Рэспублікі Беларусь, накіроўвае дзейнасць Урада Рэспублікі Беларусь на забеспячэнне ажыццяўлення ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы, выкананне Праграмы дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь, ажыццяўленне іншых паўнамоцтваў, ускладзеных на Урад Рэспублікі Беларусь;

1.2. накіроўвае, каардынуе і кантралюе дзейнасць членаў Урада Рэспублікі Беларусь, кіраўнікоў іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады, дае з гэтай мэтай абавязковыя да выканання даручэнні;

1.3. назначае на пасады членаў Урада Рэспублікі Беларусь;

1.4. уносіць на разгляд Урада Рэспублікі Беларусь:

1.4.1. прапановы адносна накіравання і каардынацыі Урадам Рэспублікі Беларусь іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады;

1.4.2. прадстаўленні аб утварэнні, рэарганізацыі і ліквідацыі міністэрстваў, іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады;

1.5. фарміруе праект парадку дня пасяджэння Урада Рэспублікі Беларусь;

1.6. склікае пасяджэнні Урада Рэспублікі Беларусь і старшынствуе на іх;

1.7.падпісвае акты Урада Рэспублікі Беларусь, Генеральнае пагадненне;

1.8. кантрасігнуе подпісам акты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 97 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

1.9. прадстаўляе Урад Рэспублікі Беларусь у адносінах з іншымі органамі, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі ў Беларусі і за яе межамі;

1.10. уступае ў адносіны з урадамі замежных дзяржаў, вядзе перамовы і падпісвае міжнародныя дамовы;

1.11. уносіць на разгляд Урада Рэспублікі Беларусь прапановы адносна зацвярджэння старшынь сумесных міжурадавых камісій па пытаннях супрацоўніцтва, якія ўтвараюцца на падставе міжнародных дамоваў, заключаных ад імя Урада Рэспублікі Беларусь;

1.12. прымае рашэнне аб адкрыцці дысцыплінарнай вытворчасці ў дачыненні да міністраў і іх намеснікаў, кіраўнікоў іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады і іх намеснікаў; прымяняе да названых асоб дысцыплінарныя спагнанні;

2. Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь можа ажыццяўляць іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя Канстытуцыяй, гэтым і іншымі законамі Рэспублікі Беларусь.

3. Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь у яго адсутнасць або ў выпадку немагчымасці ім выконваць свае абавязкі замяшчаюць яго намеснікі.

4. Парадак замяшчэння Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь яго намеснікамі ўстанаўлівае Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь. У выпадку адсутнасці такога парадку Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь даручае аднаму з членаў Урада Рэспублікі Беларусь замяшчаць Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь на тэрмін не больш як шэсцьдзесят дзён.

5. Для ажыццяўлення Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь паўнамоцтваў у складзе Сакратарыята Урада Рэспублікі Беларусь утвараецца Апарат Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, кіраўнік якога назначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 50. Намеснікі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь**

Намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь у межах вызначанай Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь сферы дзейнасці:

забяспечвае выкананне Праграмы дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь, выкананне іншых ускладзеных на Урад Рэспублікі Беларусь задач і паўнамоцтваў у адпаведных напрамках дзейнасці;

забяспечвае падрыхтоўку пытанняў для разгляду на пасяджэннях Урада Рэспублікі Беларусь, папярэдне разглядае і ўзгадняе праекты законаў, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія рыхтуюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, і праекты

адпаведных актаў Урада Рэспублікі Беларусь, садзейнічае ўзгадненню пазіцый паміж членамі Урада Рэспублікі Беларусь, уносіць прапановы да парадку дня пасяджэнняў Урада Рэспублікі Беларусь;

забяспечвае ўзаемадзеянне Урада Рэспублікі Беларусь з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і Соймам Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь, іншых органаў выканаўчай улады;

удзельнічае ў разглядзе пытанняў на пасяджэннях Урада Рэспублікі Беларусь, мае права прысутнічаць на пасяджэннях Сойма Рэспублікі Беларусь і яго органаў, удзельнічаць у рабоце калегій міністэрстваў і іншых цэнтральных органаў выканаўчай улады;

па рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе кіраўніцтва кансультатыўнымі, дарадчымі і іншымі дапаможнымі органамі, якія ўтвараюцца Урадам Рэспублікі Беларусь;

прадстаўляе ва ўстаноўленым парадку Урад Рэспублікі Беларусь у адносінах з іншымі органамі, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі ў Беларусі і за яе межамі;

вядзе перамовы і падпісвае міжнародныя дамовы Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з прадастаўленымі яму паўнамоцтвамі;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым і іншымі законамі.

**Артыкул 51. Міністр Рэспублікі Беларусь - член Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Міністр Рэспублікі Беларусь:

1.1. забяспечвае выкананне Праграмы дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь, фарміраванне і рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі, выкананне іншых ускладзеных на Урад Рэспублікі Беларусь задач і паўнамоцтваў у адпаведнай сферы;

1.2. накіроўвае і каардынуе дзейнасць адпаведных цэнтральных органаў выканаўчай улады;

1.3. уносіць на разгляд Урада Рэспублікі Беларусь:

1.3.1. прапановы па вырашэнні пытанняў, звязаных з выкананнем сваіх паўнамоцтваў па кіраванні і каардынацыі дзейнасці цэнтральных органаў выканаўчай улады;

1.3.2. прапановы - у выпадку матываванай адмовы старшыні абласной дзяржаўнай адміністрацыі (падтрымкі старшынёй аблдзяржадміністрацыі матываванай адмовы старшыні раённай дзяржаўнай адміністрацыі) узгадніць прызначэнне кіраўніка тэрытарыяльнага органа міністэрства, іншага цэнтральнага органа выканаўчай улады, дзейнасць якога накіроўваецца і каардынуецца міністрам, урадавага органа (структурнага падраздзялення) ў сістэме міністэрства або кіраўніка прадпрыемства, установы, арганізацыі, якія адносяцца да сферы кіравання дадзенага міністэрства, іншага цэнтральнага органа выканаўчай улады, - аб прадастаўленні Урадам Рэспублікі Беларусь згоды на прызначэнне такога кіраўніка;

1.4. уносіць Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь прадстаўленне аб прызначэнні на пасаду першага намесніка і намеснікаў міністра і вызвалення названых асоб ад пасады;

1.5. узгадняе праекты законаў, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Урада Рэспублікі Беларусь, якія ўносяцца на разгляд Урада Рэспублікі Беларусь па пытаннях,

якія адносяцца да сферы дзейнасці міністэрства, цэнтральных органаў выканаўчай улады, дзейнасць якіх накіроўваецца і каардынуецца ім;

1.6. прадстаўляе на разгляд Урада Рэспублікі Беларусь праекты законаў, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь, распрацоўшчыкам якіх з'яўляецца міністэрства або цэнтральныя органы выканаўчай улады, дзейнасць якіх накіроўваецца і каардынуецца ім;

1.8. выдае абавязковыя для выканання загады па пытаннях, якія адносяцца да сферы дзейнасці міністэрства і цэнтральных органаў выканаўчай улады, дзейнасць якіх накіроўваецца і каардынуецца ім;

1.9. ажыццяўляе падрыхтоўку пытанняў для разгляду Урадам Рэспублікі Беларусь;

1.10. удзельнічае ў разглядзе пытанняў на пасяджэннях Урада Рэспублікі Беларусь і ўносіць прапановы па парадку дня пасяджэнняў Урада Рэспублікі Беларусь;

1.11. прадстаўляе ва ўстаноўленым парадку Урад Рэспублікі Беларусь у адносінах з іншымі органамі, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі ў Беларусі і за яе межамі;

1.12. вядзе перамовы і падпісвае міжнародныя дамовы Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з прадастаўленымі яму паўнамоцтвамі;

1.13. па рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе кіраўніцтва кансультатыўнымі, дарадчымі і іншымі дапаможнымі органамі, якія ўтвараюцца Урадам Рэспублікі Беларусь;

1.14. ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым і іншымі законамі.

2. У выпадку адсутнасці або часовай няздольнасці міністра выконваць свае абавязкі, ён замяшчаецца намеснікам міністра або іншым членам Урада Рэспублікі Беларусь, зацверджаным Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 52. Адказнасць членаў Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Члены Урада Рэспублікі Беларусь нясуць салідарную адказнасць за вынікі дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь як калегіяльнага органа выканаўчай улады.

2. Члены Урада Рэспублікі Беларусь асабіста нясуць адказнасць за стан спраў у даручаных ім сферах дзяржаўнага кіравання, а таксама за законнасць прымаемых імі рашэнняў.

3. Член Урада Рэспублікі Беларусь можа быць прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці ў парадку, прадугледжаным гэтым Законам.

4. Члены Урада Рэспублікі Беларусь не карыстаюцца ніякімі імунітэтамі і прывілеямі пры прыцягненні да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці.

5. Члены Урада Рэспублікі Беларусь за ўчыненне карупцыйных правапарушэнняў або парушэнні патрабаванняў да паводзін дзяржаўных служачых могуць быць вызвалены ад пасады Прэм'ер-міністрам у парадку, вызначаным пунктам 1 артыкула 22 гэтага Закона.

**Артыкул 53. Канфлікт інтарэсаў**

1. Член Урада Рэспублікі Беларусь не павінен выкарыстоўваць сваё службовае становішча ў асабістых інтарэсах.

2. У выпадку ўзнікнення ў члена Урада Рэспублікі Беларусь рэальнага або патэнцыяльнага канфлікту інтарэсаў ён павінен не пазней за наступны рабочы дзень пісьмова паведаміць пра гэта Ураду Рэспублікі Беларусь.

3. Член Урада Рэспублікі Беларусь не можа ўдзельнічаць у разглядзе, падрыхтоўцы і прыняцці рашэнняў, выконваць іншыя паўнамоцтвы у пытаннях, у дачыненні да якіх існуе рэальны або патэнцыйны канфлікт інтарэсаў.

4. У выпадку, калі канфлікт інтарэсаў члена Урада Рэспублікі Беларусь немагчыма ўрэгуляваць спосабам, прадугледжаным пунктам 3 гэтага артыкула, і калі ён не ўрэгулюе канфлікт інтарэсаў самастойна, Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь вызваляе гэтага члена Урада ад пасады.

**Артыкул 54. Пасяджэнні Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Арганізацыйнай формай работы Урада Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца яго пасяджэнні.

2. Пасяджэнні Урада Рэспублікі Беларусь склікаюцца Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь.

3. Пасяджэнне Урада Рэспублікі Беларусь лічыцца паўнамоцным, калі на ім прысутнічае больш за палову службовага складу Урада Рэспублікі Беларусь.

4. У выпадку, калі міністр не мае магчымасці прыняць удзел у пасяджэнні Урада Рэспублікі Беларусь, з правам дарадчага голасу ў пасяджэнні прымае ўдзел намеснік міністра.

5. Урад Рэспублікі Беларусь па прапановах членаў Урада вызначае іншых асоб, якія маюць права ўдзельнічаць у яго пасяджэннях з правам дарадчага голаса.

6. На пасяджэннях Урада Рэспублікі Беларусь старшынствуе Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, а ў выпадку яго адсутнасці, па яго даручэнні - Першы намеснік Прэм'ер-міністра або намеснік Прэм'ер-міністра ў адпаведнасці з размеркаваннем паўнамоцтваў, вызначаным Урадам Рэспублікі Беларусь.

7. Парадак дня пасяджэння Урада Рэспублікі Беларусь зацвярджае Урад Рэспублікі Беларусь па прапанове Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

8. Пасяджэнне Урада Рэспублікі Беларусь стэнаграфуецца, яго рашэнне афармляецца пратаколам, які з'яўляецца афіцыйным дакументам.

9. Стэнаграма пасяджэння Урада Рэспублікі Беларусь з'яўляецца ўнутраным рабочым дакументам, мае канфідэнцыйны характар і выкарыстоўваецца для складання пратакола пасяджэння. Стэнаграма пасяджэння Урада Рэспублікі Беларусь прадастаўляецца Сойму, Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, членам Урада Рэспублікі Беларусь па іх запыце.

10. Пратакол пасяджэння Урада Рэспублікі Беларусь накіроўваецца членам Урада Рэспублікі Беларусь, Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і Сойму, а таксама можа накіроўвацца іншым суб'ектам у адпаведнасці з Рэгламентам Урада Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 55. Сакратарыят Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Сакратарыят Урада Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе арганізацыйнае, экспертна-аналітычнае, прававое, інфармацыйнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь.

2. Сакратарыят Урада Рэспублікі Беларусь забяспечвае падрыхтоўку і правядзенне пасяджэнняў Урада Рэспублікі Беларусь і дзейнасць Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, Першага намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь і намеснікаў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

3. Сакратарыят ажыццяўляе кантроль за своечасовым прадстаўленнем органамі выканаўчай улады праектаў законаў, праектаў актаў Урада Рэспублікі Беларусь, іншых дакументаў для падрыхтоўкі іх да разгляду Урадам Рэспублікі Беларусь.

4. Сакратарыят Урада Рэспублікі Беларусь забяспечвае ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь разгляд і прадастаўленне адказаў на запыты, якія паступаюць ва Урад Рэспублікі Беларусь.

5. Сакратарыятам Урада Рэспублікі Беларусь кіруе Дзяржаўны сакратар Урада Рэспублікі Беларусь.

6. Дзяржаўны сакратар Урада Рэспублікі Беларусь мае першага намесніка і намеснікаў, якія прызначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады па прапанове Камісіі па пытаннях вышэйшага корпуса дзяржаўнай службы па выніках конкурсу ў адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўнай службе.

7. Дзяржаўныя служачыя, іншыя работнікі Сакратарыята Урада Рэспублікі Беларусь прызначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады Дзяржаўным сакратаром Урада Рэспублікі Беларусь, акрамя прызначаемых на пасаду і вызваляемых ад пасады Урадам Рэспублікі Беларусь, у парадку, вызначаным заканадаўствам аб дзяржаўнай службе.

8. Правы, абавязкі і адказнасць дзяржаўных служачых Сакратарыята Урада Рэспублікі Беларусь вызначаюцца заканадаўствам аб дзяржаўнай службе.

9. Спыненне паўнамоцтваў Урада Рэспублікі Беларусь не з'яўляецца падставай для вызвалення ад пасад дзяржаўных служачых, іншых работнікаў Сакратарыята Урада Рэспублікі Беларусь, акрамя дзяржаўных служачых, іншых работнікаў апарата Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, патранатных службаў Першага намесніка Прэм'ер-міністра і намеснікаў Прэм'ер-міністра.

10. Патранатныя службы Першага намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, намеснікаў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь і міністраў, якія не ўзначальваюць міністэрствы, утвараюцца ў складзе Сакратарыята Урада Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўныя служачыя, іншыя работнікі такіх службаў назначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады Дзяржаўным сакратаром Урада Рэспублікі Беларусь па прадстаўленні адпаведна Першага намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, намеснікаў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, і міністраў, якія не ўзначальваюць міністэрствы.

11. Структура Сакратарыята Урада Рэспублікі Беларусь зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленні Дзяржаўнага сакратара Урада Рэспублікі Беларусь.

12. Сакратарыят Урада Рэспублікі Беларусь з'яўляецца юрыдычнай асобай і дзейнічае на падставе гэтага Закона і Палажэння аб Сакратарыяце Урада Рэспублікі Беларусь, які зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

13. Каштарыс і штатны расклад Сакратарыята Урада Рэспублікі Беларусь зацвярджае Дзяржаўны сакратар Урада Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь, у межах бюджэтных асігнаванняў, прадугледжаных для забеспячэння дзейнасці Сакратарыята Урада Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 56. Кансультатыўныя, дарадчыя і іншыя дапаможныя органы, якія ўтвараюцца Урадам Рэспублікі Беларусь**

1. Урад Рэспублікі Беларусь для забеспячэння ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў утварае сталыя і часовыя кансультатыўныя, дарадчыя і іншыя дапаможныя органы.

2. Да ўдзелу ў працы кансультатыўных, дарадчых і іншых дапаможных органаў, якія ўтвараюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, могуць прыцягвацца дзяржаўныя служачыя, а таксама дэпутаты Сойма, вучоныя і іншыя спецыялісты з іх згоды.

3. Задачы, склад і арганізацыя працы кансультатыўных, дарадчых і іншых дапаможных органаў вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

4. Для аплаты працы спецыялістаў, прыцягнутых да работы ў кансультатыўных, дарадчых і іншых дапаможных органах, могуць выдзяляцца сродкі, прадугледжаныя для забеспячэння дзейнасці Сакратарыята Урада Рэспублікі Беларусь або адпаведнага цэнтральнага органа выканаўчай улады.

**Артыкул 57. Акты Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Урад, рэалізуючы свае паўнамоцтвы, на падставе Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь, выдае акты ў форме пастаноў і распараджэнняў.

2. Пастановы Урада Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца нарматыўнымі прававымі актамі, якія маюць абавязковую сілу на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

3. Распараджэнні Урада Рэспублікі Беларусь прымаюцца па арганізацыйна-распарадчых і іншых бягучых пытаннях.

4. Распараджэнні з'яўляюцца актамі аднаразовага прымянення, якія вычэрпваюць сваё дзеянне фактам іх выканання.

5. Акты Урада прымаюцца выключна на пасяджэннях Урада.

6. Акт падпісвае Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь або асоба, якая часова яго замяшчае і старшынюе на адпаведным пасяджэнні Урада Рэспублікі Беларусь.

7. Пастанова Урада Рэспублікі Беларусь падпісваецца Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь.

8. У выпадках, прадугледжаных законамі Рэспублікі Беларусь, рашэнне Урада Рэспублікі Беларусь можа быць афармлена пратакольным даручэннем.

9. Пратакольнае даручэнне афармляецца асобным дакументам, які падлягае падпісанню Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 58. Падрыхтоўка праектаў актаў Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Права ініцыятывы ў прыняцці актаў Урада Рэспублікі Беларусь маюць члены Урада Рэспублікі Беларусь.

2. Праекты актаў Урада Рэспублікі Беларусь на разгляд Урада Рэспублікі Беларусь уносяцца Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь, яго намеснікамі і міністрамі.

3. Праекты актаў Урада Рэспублікі Беларусь, унесеныя на яго разгляд, рэгіструюцца Сакратарыятам Урада Рэспублікі Беларусь. Абнародаванне праектаў пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым Законам Рэспублікі Беларусь "Аб нарматыўных прававых актах".

4. Да падрыхтоўкі праектаў пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь могуць прыцягвацца дэпутаты Сойма, вучоныя і іншыя спецыялісты з іх згоды.

5. Праекты пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь, якія маюць важнае грамадскае значэнне і вызначаюць правы і абавязкі грамадзян Рэспублікі Беларусь, падлягаюць папярэдняму абнародаванню ў парадку, устаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 59. Прынящце актаў Урада Рэспублікі Беларусь**

Пастановы і распараджэнні Урада Рэспублікі Беларусь прымаюцца на пасяджэннях Урада Рэспублікі Беларусь шляхам галасавання большасцю галасоў ад службовага складу Урада Рэспублікі Беларусь, вызначанага ў адпаведнасці з артыкулам 10 гэтага Закона. Калі праект акта атрымаў падтрымку роўна паловы службовага складу Урада Рэспублікі Беларусь і за гэты праект прагаласаваў Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, рашэнне лічыцца прынятым.

**Артыкул 60. Уступленні ў сілу актаў Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Пастановы Урада Рэспублікі Беларусь, за выключэннем пастаноў, якія змяшчаюць інфармацыю з абмежаваным доступам, уступаюць у сілу з дня іх афіцыйнага апублікавання, калі іншае не прадугледжана самімі пастановамі, але не раней за дзень іх апублікавання.

2. У выпадках, прадугледжаных законам, пастановы Урада Рэспублікі Беларусь або іх асобныя палажэнні, якія змяшчаюць інфармацыю з абмежаваным доступам, не падлягаюць апублікаванню і ўступаюць у сілу з моманту іх давядзення ва ўстаноўленым парадку да выканаўцаў, калі гэтымі пастановамі не ўстаноўлены пазнейшы тэрмін уступлення ў сілу.

3. Распараджэнні Урада Рэспублікі Беларусь уступаюць у сілу з моманту іх прыняцця, калі іншы тэрмін не ўстаноўлены самім распараджэннем, але не раней за момант прыняцця.

4. Пастановы Урада Рэспублікі Беларусь уносяцца ў Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь.

5. Афіцыйнае апублікаванне пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца на Нацыянальным прававым партале Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 10. САЦЫЯЛЬНАЕ І МАТЭРЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЧЛЕНАЎ УРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 61. Умовы аплаты працы і водпуску членаў Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Штомесячны заработак Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь складае суму, роўную 11-кратнаму памеру базавага акладу дзяржаўных служачых Рэспублікі Беларусь.

2. Штомесячны заработак намеснікаў Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь складае суму, роўную 10-кратнаму памеру базавага акладу дзяржаўных служачых Рэспублікі Беларусь.

3. Штомесячны заработак міністраў складае суму, роўную 9-кратнаму памеру базавага акладу дзяржаўных служачых Рэспублікі Беларусь.

4. Члены Урада Рэспублікі Беларусь маюць права на штогадовы водпуск працягласцю трыццаць каляндарных дзён.

**Артыкул 62. Матэрыяльна-бытавое забеспячэнне членаў Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Член Урада Рэспублікі Беларусь забяспечваецца службовым транспартным сродкам.

2. Член Урада Рэспублікі Беларусь, не забяспечаны жыллём, забяспечваецца службовым жыллём на час знаходжання на пасадзе.

3. Службовыя жылыя памяшканні, прызначаныя для засялення членамі Урада Рэспублікі Беларусь, знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы.

4. Выключэнне жылых памяшканняў, якія прадстаўляюцца членам Урада Рэспублікі Беларусь на час знаходжання на пасадзе, з ліку службовых, не дапускаецца.

5. Члену Урада Рэспублікі Беларусь на перыяд ажыццяўлення яго паўнамоцтваў выдаецца ва ўстаноўленым парадку дыпламатычны пашпарт Рэспублікі Беларусь.

6. У выпадку смерці члена Урада Рэспублікі Беларусь прадастаўляецца дапамога на яго пахаванне ў памерах і парадку, вызначаным Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 63. Гарантыі працоўных правоў членаў Урада Рэспублікі Беларусь**

Час працы на пасадзе члена Урада Рэспублікі Беларусь залічваецца ў стаж дзяржаўнай службы, агульны і бесперапынны стаж працы, стаж працы (службы) па спецыяльнасці, стаж працы, які дае права на ўстанаўленне працэнтных надбавак да заработнай платы і атрымання аднаразовай узнагароды за выслугу гадоў (за стаж работы па спецыяльнасці на гэтым прадпрыемстве), працэнтнай надбаўкі за выслугу гадоў, выплату ўзнагароджання па выніках работы.

**Артыкул 64. Пенсійнае забеспячэнне былых членаў Урада Рэспублікі Беларусь**

Пенсійнае забеспячэнне былых чальцоў Урада Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца на агульных падставах, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных законам аб дзяржаўнай службе.

## ГЛАВА 11. ПЕРАХОДНЫЯ І ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 65. Уступленне ў сілу гэтага Закона**

1. Гэты Закон уступае ў сілу на наступны дзень пасля яго апублікавання.

2. Прызнаць страціўшым сілу Закон Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 года "Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь" з наступнымі змяненнямі і дапаўненнямі.

**Артыкул 66. Прывядзенне актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам**

1. Да прывядзення актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Законам іх палажэнні прымяняюцца ў частцы, якая не супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і гэтаму Закону.

2. Ураду Рэспублікі Беларусь на працягу трох месяцаў з дня апублікавання гэтага Закона:

2.1. забяспечыць распрацоўку і прадастаўленне ў Сойм праектаў законаў, неабходных для рэалізацыі гэтага Закона;

2.2. прыняць нарматыўныя прававыя акты, якія вынікаюць з гэтага Закона, прывесці свае нарматыўныя прававыя акты ў адпаведнасць з гэтым Законам;

2.3. забяспечыць прывядзенне рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь іх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам.